ГРОДЗЕНСКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

ГРОДНЕНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

# РАШЭННЕ

# РЕШЕНИЕ

21 жніўня 2018 г. № 480

г. Гродна

г. Гродно

Аб наданні статусу і катэгорыі гісторыка-культурнай каштоўнасці

На падставе пункта 7 артыкула 93 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, разгледзеўшы рашэнне Гродзенскага абласнога савета па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны ад 23 ліпеня 2018 г. № 1, Гродзенскі абласны выканаўчы камітэт РАШЫЎ:

1. Надаць культурнай каштоўнасці “Рэчава-манетны скарб: 11 пярсцёнкаў, 2 бранзалеты, 2 пласціны, 9 зліткаў, 2 падвескі, завушніца, памятны медаль Каралеўства Прусія, 23 залатыя манеты, 2 камяні-ўстаўкі да пярсцёнкаў, 7 зубных каронак, 3 дакументы з машынапісным тэкстам, дэталь для ювелірных вырабаў, устаўка дэкаратыўная, 2 скрынкі, стужка металічная” статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “3”.

2. Надаць культурнай каштоўнасці “Капліца-пахавальня Кочанаў”, 1-я палова XX ст., в. Івашкаўцы Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “3”.

3. Надаць культурнай каштоўнасці “Марыянская кальварыя в. Дубок: касцёл Маці Божай Нястомнай Дапамогі, капліца-пахавальня, капліца-грот, капліца-брама”, 1-я палова XX ст., в. Дубок Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “3”.

4. Кантроль за выкананнем дадзенага рашэння ўскласці на начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Клімовіч А.В.

Старшыня У.В.Краўцоў

Кіраўнік спраў І.А.Папоў

Для документов 1

ГП, з. 3359"ц"-12. т. 5000

ГРОДЗЕНСКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

ГРОДНЕНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

# РАШЭННЕ

# РЕШЕНИЕ

19 кастрычніка 2018 г. № 617

г. Гродна

г. Гродно

Аб унясенні змяненняў у рашэнне Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта ад 21 жніўня 2018 г. № 480

У адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 40 Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 года «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь» Гродзенскі абласны выканаўчы камітэт РАШЫЎ:

Пункты 1 – 3 рашэння Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта ад 21 жніўня 2018 г. № 480 «Аб наданні статусу і катэгорыі гісторыка-культурнай каштоўнасці» выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«1. Надаць матэрыяльнай культурнай каштоўнасці «Рэчава-манетны скарб (канец XIX – 1-я палова XX стагоддзя): 11 пярсцёнкаў (канец XIX – пачатак XX стагоддзя), 2 бранзалеты (канец XIX – пачатак XX стагоддзя), 2 пласціны (канец XIX – пачатак XX стагоддзя), 9 зліткаў (канец XIX – пачатак XX стагоддзя), 2 падвескі (канец XIX – пачатак XX стагоддзя), завушніца (канец XIX – пачатак XX стагоддзя), памятны медаль Каралеўства Прусіі (1823 год), 23 залатыя манеты (XVIII – пачатак XX стагоддзя), 2 камяні-ўстаўкі да пярсцёнкаў (канец XIX – пачатак XX стагоддзя), 7 зубных каронак (1-я палова XX стагоддзя), 3 дакументы з машынапісным тэкстам (1936 – 1937 гады), дэталь для ювелірных вырабаў (канец XIX – пачатак XX стагоддзя), устаўка дэкаратыўная (канец XIX – пачатак XX стагоддзя), 2 скрынкі (1-я палова XX стагоддзя), стужка металічная (1-я палова XX стагоддзя)», якая перададзена на захоўванне ўстанове культуры «Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей», размешчанай па адрасе: г. Гродна, вул. Замкавая, 20, статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі «3».

2. Надаць матэрыяльнай культурнай каштоўнасці «Капліца-пахавальня Качаноў», пачатак XX стагоддзя, размешчанай на могільніку заходняй ускраіны в. Івашкаўцы Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці, статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі «3».

3. Надаць матэрыяльнай культурнай каштоўнасці «Марыянская кальварыя в. Дубок: касцёл Маці Божай Нястомнай Дапамогі (паўднёва-ўсходняя ўскраіна

вёскі) 1929 года, капліца-пахавальня (0,5 км на паўночны захад ад вёскі) 1936 года, капліца-грот (0,8 км на паўночны захад ад вёскі) 1936 года, капліца-брама (1,5 км на паўночны захад ад вёскі) 1936 года», размешчанай у в. Дубок Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці, статус гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі «3».».

Старшыня У.В.Краўцоў

Кіраўнік спраў І.А.Папоў